

# Хроніка пераломных падзей

**Нацыянальная бібліятэка разам з Нацыянальным архівам распачала цыкл выстаў да 80-годдзя вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. "Зара вызвалення займаецца над Беларуссю" — назву праекту далі словы Якуба Коласа, апублікаваныя ў перыядычным друку яшчэ ў 1942-м.**

Першая часовая экспазіцыя змяшчае той самы нумар газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну", у якім народны паэт абвясціў: "На Захад ідзе Чырвоная армія, жалезнай мятлою вымятае грабежныя орды ашалелага фашызму". Зварот класіка быў апублікаваны праз тры месяцы пасля бітвы за Маскву — аднаго з пераломных момантаў Вялікай Айчыннай вайны.

Побач з каштоўнымі асобнікамі газеты, якія рэдка і кароткі тэрмін паказваюцца публіцы, дэманструюцца іншыя перыядычныя выданні і нават кнігі, надрукаваныя ў час ліхалецця. Яны служылі своеасаблівай зброяй у барацьбе з ворагам, умацоўвалі дух салдат, партызан і падпольшчыкаў, мірных жыхароў. Акрамя таго, прадстаўлены сучасныя энцыклапедыі, даведнікі, манаграфіі. Дапаўняюць збор копіі архіўных дакументаў — актаў, загадаў, пастаноў, дзённікаў баявых дзеянняў партызанскіх атрадаў.

Усе гэтыя матэрыялы распавядаюць пра стан акупаванай тэрыторыі Беларусі і факты генацыду мірнага насельніцтва. Выстава рэканструюе асноўныя эпізоды, звязаныя з пачаткам вызвалення рэспублікі ў верасні — снежні 1943 года, ад фарсіравання Дняпра і выгнання фашыстаў з Камарына да Гарадоцкай наступальнай аперацыі, дэакупацыі Езярышча ды Гарадка. Цыкл экспазіцый мусіць паказаць хроніку адной з найважнейшых падзей у лёсе беларускага народа, паспрыяць фарміраванню гістарычнай свядомасці і выхаванню патрыятызму.

**Матэрыялы рубрыкі падрыхтаваў Данііл ШЭЙКА**
Фота з архіваў устаноў